# РАЗДЗЕЛ I
# Праблемы архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

*Аўсейчык У.Я.*

## ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ СТАРАВЕРСКАГА ХРАМАБУДАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай*
*(Паступіў у рэдакцыю 14.02.2023)*

Староверскае храмабудаўніцтва на беларускіх землях з'яўляецца цікавым і ўнікальным феноменам. На яго фарміраванне аказалі ўплыў разнастайныя фактары (рэлігійныя асаблівасці стараверства, традыцыі народнага дойлідства перасяленцаў з Расіі, прыроднае асяроддзе і спецыфіка беларускага ландшафту і інш.). У значнай ступені развіццё храмабудаўніцтва вызначалі таксама канкрэтныя гістарычныя ўмовы і прававыя нормы. Мэта дадзенага артыкула – разгледзець гісторыка-прававыя аспекты, якія ўплывалі на функцыянаванне і архітэктурнае аблічча стараверскіх храмаў на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст.

Становішча старавераў у 2-й палове XVII – XVIII ст. у Рэчы Паспалітай было значна лепшым, чым у расійскай дзяржаве. Прыхільнікі старых абрадаў не мелі тут прыцясненняў, у тым ліку ў культавай сферы. Аднак пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі прававое становішча

стараверaў значна пагоршылася. Гэта датычылася і сферы храмабудаўніцтва. У Расіі на працягу XVIII ст. быў выдадзены шэраг рэпрэсіўных указаў і пастаноў, якія датычыліся культавых аб’ектаў старвераў. Так, указам ад 1734 г. забаранялася будаўніцтва новых стараверскіх храмаў. А ў 1768 г. Свяшчэнны Сінод увогуле пастанавіў, што «оным церквам и часовням быть не должно, дабы из того православным развращения последовать не могло». У 1778 г. была пацверджана забарона на будаўніцтва стараверскіх храмаў, забаранялася таксама мець пры іх званы [18, с. 1, 2 – 3].

На пачатку XIX ст. у Расійскай імперыі наступіў перыяд даволі лаяльнага стаўлення да «расколу». Аднак і ў гэты час улады не давалі афіцыйнага дазволу на будаўніцтва стараверскіх храмаў. Даволі красамоўна такое стаўленне выражалася наступнымі словамі: «Правительство хотя и не позволяло явным образом учреждать подобные заведения [храмы. – *А. У.*], но однако ж терпело оные» [18, с. 52]. Аднак ужо ў 1817 г. быў прыняты ўказ аб забароне на будаўніцтва стараверскіх храмаў. А Камітэт міністраў яшчэ раз нагадаў мясцовым уладам «о строжайшем наблюдении, дабы вновь таковыя заведения отнюдь не были учреждаемы» [18, с. 52]. Замацаванне забароны на будаўніцтва стараверскіх храмаў адбылося ў 1820-я гады. Так, у 1822 г. былі зацверджаны правілы, згодна з якімі стараверам у Расійскай імперыі забаранялася будаваць новыя храмы. Пры гэтым у іх пацвярджалася, што раней узведзеныя цэрквы пакідаліся «без разыскания» [18, с. 69]. У 1826 г. імператар Мікалай I пацвердзіў дзейнасць гэтых правіл [18, с. 89], і дадзеная дата стала прынцыповай мяжой. Такім чынам, у наступныя перыяды легальна магла дзейнічаць толькі пабудаваная да 1826 г. стараверская царква. А таму ў афіцыйных дакументах сярэдзіны XIX ст. пры згадках аб дзеючых стараверскіх

храмах часта дадавалася «построена до 1826 г.». У гэтым жа годзе было выдадзена прадпісанне аб ажыццяўленні рэгулярнага збору звестак аб культавых пабудовах стараавераў [18, с. 88]. А ў 1827 г. выйшла распараджэнне аб забароне на ўсялякі рамонт і аднаўленне стараверскіх храмаў. Тлумачылася гэта тым, што «раскольники, по известному их упорству и ожесточённо в своих заблуждениях, легко могут, под предлогом поправок или переделок в молельнях своих, устроивать оныя вновь» [18, с. 88].

Ужо ў 1820-я гады на беларускіх землях фіксуюцца выпадкі закрывання («запячатвання») стараверскіх храмаў. Так, у 1823 г. была запячатана маленная ў горадзе Відзы. У якасці прычыны закрыцця ўказвалася тое, што стараверскі святар «отвернул от православной церкви» некаторых праваслаўных і перахрысціў іх у стараверства [4, арк. 84 – 84адв].

Значная колькасць указаў і распараджэнняў па справах «расколу» была прынята ў 1830 – 1840-х гадах. Гэты перыяд адзначаецца яшчэ больш рэпрэсіўнай палітыкай царскага ўрада ў адносінах да стараавераў, у тым ліку і сферы храмабудаўніцтва. Паказальным для характарыстыкі прававога статусу стараверскіх храмаў у дадзены час з'яўляецца тое, што яны ўвогуле не лічыліся законнымі («не признавая раскольнические заведения законносуществующими» [1, с. 316]). А таму старавeрам забаранялася мець пры сваіх храмах пячаткі і выдаваць «из них свидетельства в исполнении христианских обязанностей» [1, с. 316]. Упершыню такая забарона была накладзена ў 1834 г. на стараавераў Рагожскіх могілак у Маскве [18, с. 125 – 126]. Пачынаючы з 1834 г. адабранне ў стараавераў пячатак ажыццяўлялася і на беларускіх землях [2, с. 98].

Абмежаванні, якія накладаліся на стараавераў (немагчымасць

рамантаваць, аднаўляць храмы і будаваць новыя), прывялі да таго, што богаслужэнні сталі праводзіцца ў хатах. У адказ на гэта 28 красавіка 1836 г. быў выдадзены царскі ўказ «О воспрещении обращать крестьянские избы в старообрядческие молельни и устраивать в молельнях престолы». Згодна з ім, стараверам забаранялася пераўтвараць хаты ў публічныя маленныя, а таксама ўсталёўваць у храмах прастолы, якія разглядаліся як элемент выключна праваслаўных (сінадальных) цэркваў. Але пры гэтым указ дазваляў захаваць тыя прастолы, «коих существование дозволено на основании законов» [18, с. 170].

У 1839 г. царскім указам былі зацверджаны правілы, якія рэгламентавалі закрыццё і знішчэнне незаконна пабудаваных ці адрамантаваных стараверскіх храмаў . Так, згодна з імі, «противозаконно построенную или возобновлённую часовню или моленную раскольничью» губернскае кіраўніцтва павінна запячатваць і данесці аб гэтым у Міністэрства ўнутраных спраў. МУС, у сваю чаргу «полагает мнение об оставлении оной запечатанною или о совершенном уничтожении, и представляет на разрешение Секретного Комитета». Калі ж запячатаны храм будзе самавольна распячатаны або там зноў пачнуць збірацца стараверы, то за гэтае паўторнае незаконнае дзеянне храм павінен быць разбураны [18, с. 261 – 262].

Як вынікае з аналізу матэрыялаў, у некаторых выпадках усё ж дазвалялася распячатванне стараверскіх храмаў. Але яно было магчымым толькі ў выпадку наступнага пераводу ў аднаверства. Так, згодна з распараджэннем ад 13 студзеня 1846 г., міністру ўнутраных спраў «в важных и экстренных случаях» было дадзена права «распячатваць» раней закрытыя стараверскія храмы і пераўтвараць іх у аднаверскія [18, с. 357]. Пераасвячэнне стараверскіх храмаў у

аднаверскія стала адной з формаў барацьбы з «расколам» у сярэдзіне XIX ст. Так, у 1852 – 1853 гг. у Віцебску і Віцебскім павеце дзве маленныя былі перароблены ў аднаверскія храмы [9; 10].

У пачатку 1840-х гадоў быў выдадзены яшчэ шэраг рэпрэсіўных указаў і пастаноў. Так, у 1840 г. выйшла пастанова аб забароне на выкарыстанне званоў у стараверскіх храмах. Згодна з ёй, пры выяўленні такіх выпадкаў званы трэба было здымаць і перадаваць у праваслаўныя ці аднаверскія храмы. Пры гэтым адзначалася, што спецыяльных пошукаў па выяўленні званоў у стараверскіх цэрквах праводзіць не трэба [18, с. 291]. У 1841 г. распараджэнне было ўдакладнена. 27 красавіка імператар Мікалай І уласнаручна «начертал следующую Высочайшую резолюцию: “Считаю достаточным отобрать только те колокола, которые висят на открытом воздухе; колокольчики внутри покоев отбирать будет, кажется, излишним”» [18, с. 299]. Архіўныя матэрыялы сведчаць аб выкананні дадзенага распараджэння ў адносінах стараверскіх храмаў на беларускіх землях [6; 8]. З мэтай панізіць статус стараверскіх храмаў 13 кастрычніка 1842 г. быў выдадзены ўказ «О воспрещении именовать раскольнические молитвенные здания церквями». Згодна з ім, стараверскія храмы забаранялася ў афіцыйных дакументах называць «цэрквамі», а толькі «моленными» ці «часовнями» [18, с. 315 – 316].

Такім чынам, прынятыя ў 1-й палове XIX ст. нарматыўныя акты, якія датычыліся культавых пабудоў старавераў, насілі яўны рэпрэсіўны характар. У гэты перыяд ажыццяўляўся таксама строгі кантроль з боку дзяржаўных органаў і праваслаўнай царквы за іх выкананнем. Як вынікае з аналізу архіўных дакументаў, на беларускіх землях найбольш пільна адсочваліся рамонт і ўладкаванне новых стараверскіх храмаў. Так, 24 мая 1850 г. быў накіраваны рапарт Бабруйскага благачыннага

протаіерэя І. Філіпоўскага на імя епіскапа Мінскага і Бабруйскага Міхаіла. У рапарце адзначалася, што «в деревне Солотин <…> старообрядцы построили <…> моленную за исключением нескольких брёвен новую, на месте бывшей ветхой» [5, арк. 1]. У выніку ў 1851 г. маленная была запячатана [5, арк. 8]. У сваю чаргу, закрыццё цэркваў суправаджалася супраціўленнем насельніцтва. Так, крыніцы паведамляюць аб актыўным супраціўленні стараовераў пры закрыцці іх храмаў у Полацкім павеце ў 1853 г. [18, с. 466].

Як вынікае з аналізу крыніц, у выніку закрыцця храмаў стараверы пачалі спраўляць рэлігійныя абрады па хатах. Але фіксаваліся выпадкі, калі ва ўмовах закрытых храмаў богаслужэнні праводзілі нават у гаспадарчых пабудовах. Згодна з больш познімі ўспамінамі, у сярэдзіне XIX ст., калі храм у вёсцы Кублішчына Дзісенскага павета быў закрыты, службы праводзіліся па асецях і «сенных сараях» [20, с. 1441]. А стараверы Слабады Мар'інай Гомельскага павета паведамлялі наступнае: «И теперь ещё есть очевидцы, которые помнят то страшное время. Храмы были разорены и запечатаны, и священники совершали требы по гумнам, в банях и амбарах» [19, с. 1127].

Некаторае паслабленне рэпрэсій у адносінах да стараавераў, асабліва на заходнебеларускіх землях, назіралася ў 1860-х гадах. З-за іх удзелу ў падаўленні паўстання 1863 г. царскі ўрад дазволіў адкрыць некаторыя храмы. Так, у 1863 г. была «распячатана» маленная ў вёсцы Кублішчына Дзісенскага павета [18, с. 599]. А на беларускіх землях Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні, як сведчаць афіцыйныя даныя, былі адкрыты ў 1864 г. храмы ў горадзе Відзы і вёсцы Кірыліна (сучасная тэрыторыя Браслаўскага р-на) [14, с. 389]. Пры гэтым на тэрыторыі беларускіх губерняў справа па «распячатванні» старaверскіх храмаў у дадзены перыяд не насіла сістэмны характар.

У 1864 г. былі перагледжаны некаторыя пастановы па справах «расколу». Шэраг з іх датычыўся пытанняў стараверскага храмабудаўніцтва. У гэты перыяд усіх старавераў падзялілі на «более и менее вредные» (да «больш шкодных» адносілі тых, якія не прызнавалі таінстваў і шлюбаў, не маліліся за цара і г. д.). Паслабленні гэтага перыяду датычыліся катэгорыі «менш шкодных» старавераў. Згодна з новымі пастановамі, дазваляўся рамонт іх храмаў. Аднак, у сваю чаргу, яны не маглі мець ніякіх знешніх прыкмет культавых пабудоў. Дазвалялася распячатваць храмы дазволу міністра ўнутраных спраў і кіраўніцтва губерні, а таксама перарабляць у храмы жылыя пабудовы [18, с. 614].

Нягледзячы на некаторыя паслабленні, якія, аднак, датычыліся толькі катэгорыі «менш шкодных» старавераў, паляпшэння сітуацыі не адбылося. У адносінах да большай часткі старавераў Беларусі ў гэты перыяд па-ранейшаму захоўваўся строгі кантроль за будаўніцтвам і самавольным адкрыццём храмаў, пра што сведчаць крыніцы. Так, згодна з рапартам лепельскага павятовага спраўніка, у снежні 1881 г. ён адшукаў у вёсцы Должыца Цяпінскай воласці таемна ўладкаваную маленную. У выніку ў 1882 г. яна была запячатана [11, арк. 1 – 8].

Сапраўдныя сур’ёзныя змены ў адносінах да стараверскага храмабудаўніцтва прынёс закон («Высочайше утверждённое мнение Государственного Совета») «О даровании раскольникам некоторых прав гражданских и по отправлению духовных треб» ад 3 мая 1883 г. Згодна з ім, стараверы надзяляліся грамадзянскімі правамі (атрымлівалі пашпарты для перамяшчэння па краіне, ім дазвалялася займацца гандлем, промысламі, уступаць у іканапісныя цэхі, займаць грамадзянскія пасады). Разам з тым, закон дараваў некаторыя рэлігійныя свабоды (праводзіць богаслужэнні і спраўляць духоўныя «требы» ў

дамах і храмах без парушэння грамадскага парадку, выконваць пахавальна-памінальныя абрады). Таксама прадугледжваўся шэраг паслабленняў і ў адносінах стараверскага храмабудаўніцтва. Так, стараверам дазвалялася «исправлять и возобновлять» храмы, якія разбураліся. Напярэдадні правядзення такіх работ патрабавалася атрымаць дазвол губернатара ці кіраўніка вобласці. Такі рамонт павінен ажыццяўляцца пры ўмове, што знешні выгляд гэтых аб'ектаў не будзе зменены. Але ў выпадку, калі перабудова малітоўнага дома адбывалася са зменай знешняга выгляду, патрабаваўся ўжо дазвол міністра ўнутраных спраў. Таксама дазвалялася распячатванне стараверскіх храмаў (за выключэннем манастыроў і скітаў). Адкрыццё раней закрытых храмаў дапускалася толькі з дазволу міністра ўнутраных спраў і пры ўмове, «чтобы распечатание производилось без всякаго торжества». У мясцовасцях, дзе стараверскае насельніцтва не мела храмаў, дазвалялася «обращать для общественного богомоления существующие строения». Аднак гэтая працэдура таксама была магчыма толькі з дазволу міністра ўнутраных спраў. Пры гэтым адзначалася, што новаўтвораны храм не павінен быць падобным да праваслаўнай царквы і не мог мець званоў. Але ў той жа час не забаранялася ўсталёўваць на стараверскіх храмах наддзверныя іконы і крыжы [16, с. 219 – 220].

Пасля прыняцця закона 1883 г., як сведчаць архіўныя матэрыялы, стараверы масава накіроўвалі прашэнні аб пабудове або рамонце сваіх храмаў. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) захоўваецца значная колькасць спраў, якія датычацца прашэнняў старавераў аб «разрешении им исправить молельню», або «построить молельный дом», «о разрешении открытия раскольнической молельной». Дакументы НГАБ сведчаць, што такія прашэнні паступалі і ад старавераў беларускіх губерняў. Так, у 1883 г. паступае прашэнне ад

старавераў Сцепскай воласці Бабруйскага павета «о разрешении им устроить молитвенный дом» [7], а ў наступным годзе – ад старавераў вёскі Забор’е Полацкага павета [12].

Нягледзячы на прыняты закон, мясцовае кіраўніцтва даволі строга адсочвала рамонт і будаўніцтва новых стараверскіх цэркваў. Частымі былі выпадкі закрыцця храмаў, адрамантаваных ці адкрытых без атрымання дазволу. Але, як сведчаць матэрыялы, сітуацыя ў розных частках Беларусі ў гэты перыяд была неаднолькавай. У заходнім рэгіёне стаўленне да стараверства было больш лаяльным. Так, па данясенні павятовага спраўніка, у 1883 г. на тэрыторыі Свянцянскага павета дзейнічалі 4 стараверскія маленныя (у Апідамах Лынтупскай воласці, Куклянах Гадуцішскай, Міхалове Даўгелішскай, Юргелішках Мелегянскай валасцей). Два з гэтых храмаў адносяцца да сучаснай тэрыторыі Беларусі (в. Апідамы і Кукляны, сучасная тэрыторыя Пастаўскага р-на). У данясенні адзначалася, што гэтыя маленныя «построенные наподобие православных храмов с колокольнями, на которых имеются кресты, а также привешаны рельсы вместо колоколов, кои от удара молотками издают звук похожий на колокольный звон». Высвятленне сітуацыі паказала, што гэтыя храмы з 1875 г. рамантаваліся без атрымання дазволу. Але з улікам закона ад 3 мая, а таксама вялікай колькасці стараверў у рэгіёне было вырашана не закрываць гэтыя храмы. Адзінае, яны павінны былі пазбавіцца званіц, а іх знешні выгляд мусіў быць прыведзены ў адпаведнасць з наяўнымі правіламі [15].

Найбольш сур’ёзныя змены ў дзяржаўна-прававым рэгуляванні стараверскай царквы ў пачатку ХХ ст. выклікаў указ ад 17 красавіка 1905 г. «Об укреплении начал веротерпимости». Ён істотным чынам палепшыў прававое становішча стараверў у Расійскай імперыі, пазітыўна адбіўся і ў дачыненні да іх храмабудаўніцтва. Згодна з указам,

стараверам дазвалялася будаўніцтва і рамонт культавых пабудоў на тых жа ўмовах, што і «инославных исповеданий». Таксама ўказ прадпісваў «распячатванне» ўсіх раней закрытых малітоўных дамоў, а таксама ўстанавіў агульныя правілы для пабудовы і рамонту цэркваў і малітоўных дамоў усіх хрысціянскіх канфесій [17, с. 259]. А ўказам ад 17 кастрычніка 1906 г. «О порядке образования и действия старообрядческих общин» вызначаліся правілы будаўніцтва стараверскіх культавых аб’ектаў. Згодна з ім, «сооружение храмов, молитвенных домов, скитов и обителей разрешается старообрядцам губернаторами или градоначальниками. Для выдачи означенных разрешений необходимо: а) постановление общего собрания членов общины с ходатайством относительно предположенной постройки, и б) соблюдение в представляемом проекте испрашиваемой постройки технических требований устава строительного» [3]. Такім чынам, гэтыя прававыя акты адмянялі ранейшыя абмежаванні ў пытаннях функцыянавання, адкрыцця і рамонту стараверскіх культавых пабудоў. З гэтага часу стараверы маглі свабодна будаваць свае храмы.

З 1905 г. стараверскае храмабудаўніцтва на беларускіх землях значна актывізуецца. Пра гэта пераканаўча сведчаць архіўныя крыніцы. Так, ужо ў 1905 г. стараверы вёскі Сідараўшчына Полацкага павета падаюць прашэнне «о разрешении им построить в деревне молельню» [13]. Як вынікае з аналізу архіўных дакументаў, працэс аднаўлення і будаўніцтва новых стараверскіх храмаў на беларускіх землях расцягнуўся па часе на ўвесь пачатак XX ст.

Такім чынам, на працягу XIX – пачатку XX ст. функцыянаванне і будаўніцтва стараверскіх храмаў на беларускіх землях знаходзіліся пад жорсткім дзяржаўным кантролем. Існаванне шэрага юрыдычных абмежаванняў і забарон паўплывала не толькі на колькасць дзеючых

аб’ектаў, але і на іх архітэктурнае аблічча. Паслабленне рэпрэсіўнай царскай палітыкі ў адносінах да стараверскіх культавых пабудоў адбываецца ў канцы XIX ст. Але толькі пасля ўказа 1905 г. усе абмежаванні былі зняты, у выніку чаго стараверскае храмабудаўніцтва ў пачатку XX ст. перажывала свае «залатыя часы».

**ЛІТАРАТУРА**


1. Варадинов, Н. В. История Министерства внутренних дел / Н. В. Варадинов. – СПб. : Тип. МВД, 1863. – Т. 8. 8-я, доп. книга. История распоряжений по расколу. – [2], VI, IV, 656 с.
2. Гарбацкі, А. А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.
3. Именной высочайший Указ. О порядке образования и действия старообрядческих и сектантских общин и о правах и обязанностях входящих в состав общин последователей старообрядческих согласий и отделившихся от православия сектантов. – М. : Тип. П. П. Рябушинского, 1906. – 24 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 7963.
5. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 22858.
6. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 26394.
7. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35888.
8. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 12312.
9. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 24200.
10. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 25758.
11. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 37175.
12. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 37682.
13. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 46972.
14. Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. / ред. А. М. Сементовский. – СПб. : Тип. К. Вульфа. – [4], II, 499 с.
15. По представлению Виленского губернатора о самовольно построенных старообрядцами молельнях в деревнях: Эпидемах, Михалове, Юргелишках и Куклянах (28 сентября 1883 г.) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://r-

element.com/arkhivnoe-delo/arkhivnye-nakhodki/vyderzhki-i-kratkie-opisaniya-iz-neskolkikh-del-soderzhashchikh-interesnye-svedeniya-o-staroobryadtsakh-vilenskoj-gubernii.

16. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3-е. – СПб. : Гос. тип., 1886. – Т. 3; 1883, от № 1293 – 1933 и дополнения. – 979 с.

17. Полное собрание законов Российской империи: Собрание 3-е. – СПб. : Гос. тип., 1908. – Т. 25, отделение 1: 1905, от № 25605 – 27172 и дополнения. – [2], 966, 157 с.

18. Собрание постановлений по части раскола. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : Тип. МВД, 1875. – [4], 694, 65 с.

19. Церковь. – 1908. – 7 сентября.

20. Церковь. – 1908. – 23 ноября.

## РЕЗЮМЕ

В статье рассмотрены исторические и правовые аспекты старообрядческого храмостроения на белорусских землях в XIX – начале XX в. Прослежена эволюция законодательства, регламентирующего данную сферу. Выявлены факторы, повлиявшие на функционирование и архитектурный облик культовых строений старообрядцев в указанный период.

## SUMMARY

The article considers the historical and legal aspects of the Old Believers’ church building on the Belarusian land in the XIXth – early XXth centuries. The evolution of the legislation regulating this sphere is traced. The factors that influenced the functioning and architectural appearance of the Old Believers’ religious buildings in the mentioned period are revealed.